4. Родевич Т.Н. Ценностные ориентации и досуговые интересы молодежи в социокультурной деятельности // Научно-техническая революция и проблемы гуманизма. Сб. науч. тр. под ред. Ю.А.Гусева. — Мн., 2002. — С. 16—21.

5. Смалянчук А. Дзённік Міхала Ромера як крыніца па гісторыі Беларусі пачатку XX ст. // Беларускі гістарычны агляд. — Т. 5. — Мінск, 1998. — С. 103—111.

6. Цьвікевіч А. "Западно-руссизм": Нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX — пачатку XX стст. — 2-е выд. — Мн.: Навука і тэхніка, 1993. — 352 с.

*Кузьмініч М.Л.*

## ВНУ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВА ЯК СУБ'ЕКТЫ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў ГРАМАДСТВЕ

ВНУ культуры і мастацтва займаюць важнае месца ў рэалізацыі сацыякультурнай палітыкі ў сучасным беларускім грамадстве. Універсітэт культуры, акадэміі музыкі і мастацтваў — вышэйшыя навучальныя ўстановы сістэмы адукацыі, закліканыя "забяспечыць найбольш поўнае развіццё здольнасцей і інтэлектуальна-творчага патэнцыялу асобы, магчымасць яе актыўнага, свабоднага і канструктыўнага ўдзелу ў развіцці грамадства з мэтай задавальнення патрэбнасцей грамадства і дзяржавы ў спецыялістах высокай кваліфікацыі" [1]. Змест дзейнасці гэтых вышэйшых навучальных устаноў увабраў шматвяковы гістарычны вопыт універсітэцкай адукацыі [4; 38-48].

Яшчэ ў Старажытнай Грэцыі ў адпаведнасці з класавым размежаваннем з'явіліся дзве сістэмы грамадскай адукацыі. Мэтай першай стала фарміраванне навыкаў практычнай працы, а другой — перадача духоўных і культурных каштоўнасцей. Пачынаючы з XI–XII стст., еўрапейскі універсітэт становіцца незалежнай, аўтаномнай установай. Ён забяспечваў развіццё і перадачу перадавых ведаў, а таксама навучаў метадам іх атрымання. Сутнасць універсітэта навукова-даследчага тыпу на мяжы XVIII–XIX стст. сфармуляваў В.Гумбальт: спалучэнне даследаванняў і навучання пры забеспячэнні свабоды для выкладчыкаў і студэнтаў ад умяшання з боку дзяржавы.

Са зменай сацыяльных каштоўнасцей у грамадстве мянялася і канцэпцыя універсітэцкай адукацыі. Так, для англійскіх утылітарыстаў XIX ст. галоўным у змесце адукацыі стала ступень яе карысці для грамадства. Функцыя універсітэта, на думку утылітарыстаў, — у правяд-

зенні навуковых даследаванняў і навучанні даследчым прафесіям, пры гэтым перавага аддавалася прыкладному (а не абстрактнаму) характару дзейнасці універсітэта. Дж.Генры сутнасць універсітэта бачыў не ў простым павелічэнні аб'ёмаў ведаў студэнтаў, а ў іх выхаванні, развіцці разумовай дзейнасці, засваенні метадаў пошуку, сузірання, здабывання і ацэньвання ісціны, у стварэнні ўмоў для паглыблення ў свет навукі. Місія універсітэта ліберальных мастацтваў Ньюмэна — у захаванні, распаўсюджанні і трансляцыі духоўных набыткаў грамадства, але не ў здабыванні новых ведаў і правядзенні даследчай работы.

У першай палове XX ст. А.Н.Уайтхэд разглядаў універсітэт як школу адукацыі і даследаванняў. Х.Артэга-і-Гасэт функцыю універсітэта бачыў у далучэнні чалавека да культуры, фарміраванні яго прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў. Навуковая рабта пры гэтым не з'яўлялася асноўнай і неабходнай часткай універсітэцкай дзейнасці. Нямецкі навуковец К.Яскерс, наадварот, падкрэсліваў даследчыцкі аспект у дзейнасці універсітэта. На яго думку, мэта навучання — правядзенне даследаванняў, пошук ісціны, у працэсе чаго фарміруецца асоба чалавека, яго агульная культура. Акрамя правядзення даследчай работы, адукацыі чалавека, яго прафесіянальнай падрыхтоўкі, універсітэт адначасова выступае ў якасці прафесійнага, культурнага, даследчага інстытута.

У Масачусецкім універсітэце (ЗША) у 1960-я гады былі прапанаваны чатыры ідэальныя мадэлі універсітэта як цэнтра навукі, падрыхтоўкі спецыялістаў, сацыяльных паслуг, падрыхтоўкі служачых. Гэтая і іншыя ідэі знайшлі сваю практычную рэалізацыю ў перадавых краінах свету на працягу другой паловы XX ст. Пры гэтым ва універсітэтах ЗША прыярытэт надаецца фундаментальным даследаванням, якія даюць новыя веды, устанаўленню прадуктыўных сувязей з практыкай.

Аўтарытэт універсітэцкай адукацыі ў Оксфардзе і Кембрыджы (Велікабрытанія) забяспечваецца перш за ўсё навучаннем студэнтаў і элітарнай накіраванасцю адукацыі. Вучэбныя курсы іншых універсітэтаў у краіне арыентуюцца на канкрэтныя галіны прамысловасці і бізнесу.

Універсітэты Францыі забяспечваюць, у асноўным, навучанне, даюць веды па агульнаадукацыйных і гуманітарных дысцыплінах. Універсітэты Германіі працягваюць традыцыі спалучэння даследчыцкай працы з вучэбным працэсам пры вялікай увазе да фарміравання асобы студэнта.

Першы беларускі нацыянальны дзяржаўны універсітэт (БДУ) быў заснаваны ў 1921 г. Ён працягваў традыцыі Маскоўскага універсітэта

— рыхтаваў кадры нацыянальнай навукова-тэхнічнай, прыродазнаўча-навуковай і гуманітарнай інтэлігенцыі краіны. І на мяжы XX – XXI стст. БДУ застаецца цэнтрам падрыхтоўкі кадравых навукоўцаў, арганічна спалучаючы ў сабе якасныя параметры адукацыйнага, навуковага і культурнага цэнтра грамадства, забяспечваючы высокі ўзровень фундаментальнай падрыхтоўкі спецыялістаў.

З улікам назапашанага ў гісторыі універсітэцкай адукацыі вопыту, на пачатку 1990-х гадоў ва ўстановы універсітэцкага тыпу ператвараліся інстытут культуры, кансерваторыя, тэатральна-мастацкі інстытут. Перабудова іх дзейнасці вялася ў рэчышчы сучаснай ідэалогіі універсітэцкай адукацыі: універсітэт — гэта вучэбны, навуковы, культурны і сацыяльны цэнтр; яго асноўныя функцыі — навучальная, даследчая, прафесійная, гуманітарная, сервісная; мэты і задачы функцыянавання — падрыхтоўка спецыялістаў, інтэлектуальнай эліты грамадства, захаванне і перадача грамадскага вопыту, удзел у эканамічным і сацыяльна-культурным развіцці сваёй краіны і інш.

На пачатку XXI ст. Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры будуе сваю дзейнасць у адпаведнасці з класічнымі традыцыямі універсітэцкай адукацыі на аснове прынцыпаў адзінства адукацыі, навуковай і творчай дзейнасці, сувязі навукова-педагагічнага працэсу з практыкай. Ён мае статус вядучай ВНУ у сістэме нацыянальнай адукацыі ў галіне культуры і шмат у чым вызначае месца і ролю профільнага універсітэта ў сацыяльна-культурнай сферы беларускага грамадства. Сярод асноўных мэт яго дзейнасці — задавальненне патрэбнасцей асобы ў атрыманні вышэйшай адукацыі і кваліфікацыі, у яе інтэлектуальным, маральным, культурным і фізічным развіцці на аснове адзінства навучальнага працэсу, навуковых даследаванняў і мастацка-творчай дзейнасці; культурна-адпачынкавае абслугоўванне насельніцтва, шырокая канцэртная дзейнасць з мэтай эстэтычнага выхавання моладзі і дарослых, прапаганда дасягненняў нацыянальнай культуры, здабыткаў нацыянальнага мастацтва і інш [7, 5].

Інтэнсіўная мастацка-творчая дзейнасць і культурна-адпачынкавае абслугоўванне насельніцтва з'яўляюцца важнейшымі накірункамі дзейнасці універсітэта, якія забяспечваюць комплексную рэалізацыю ўсіх яго асноўных функцый — навучальнай, даследчай, прафесійнай, гуманітарнай і сервіснай. Гэта дае падставы разглядаць БДУ культуры не проста як элемент сістэмы адукацыі, а як своеасаблівы сацыяльна-культурны інстытут беларускага грамадства, які ажыццяўляе духоўную вытворчасць, забяспечвае трансляцыю ведаў і традыцыйных элементаў культуры, рэгулюе развіццё культуры, займаецца арганізацыяй, планаваннем і кіраваннем культурным працэсам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як сацыяльна-культурны інстытут грамадства, універсітэт у працэсе мастацка-творчай, культурна-шэфскай, дабрачыннай дзейнасці рэалізуе вылучаемыя навукоўцамі (Г.Драч, А.Каргін, А.Смолік) адпаведныя функцыі: рэгулятыўную (забяспечвае рэгуляванне ўзаемаадносін паміж членамі грамадства шляхам выпрацоўкі нормаў паводзін); інтэгратыўную (распаўсюджвае сукупнасць поглядаў, перакананняў, каштоўнасцей, ідэалаў, характэрных для беларускай культуры, захаванне культурнай спадчыны, нацыянальных традыцый, гістарычнай памяці, што садзейнічае ўстанаўленню сувязей паміж пакаленнямі, згуртаванню нацыі); трансляцыі культурнага вопыту ад аднаго пакалення да другога, ад аднаго народу да другога; захавання, перадачы і развіцця элементаў сацыяльнай і культурнай спадчыны; камунікатыўную (забяспечвае трансляцыю сацыяльна важнай інфармацыі, інтэграцыю грамадства і сацыяльных груп, унутраную і знешнюю дыферэнцыяцыю соцыуму і груп; культурна-адпачынкавую, скіраваную на рэалізацыю творчага і духоўнага патэнцыялу асобы; рэкрэацыйную і кампенсатарную, скіраваную на аднаўленне сіл, аздараўленне праз арганізацыю адпаведных забаўляльных, гульнёвых, аздараўленчых, мастацка-творчых праграм; сацыялізацыі асобы праз стварэнне разнастайных умоў, якія забяспечваюць перавод рэальна існуючых у грамадстве адносін у пэўныя якасці асобы [6, 19]. Пералічаныя функцыі адпавядаюць мэтам дзейнасці універсітэта культуры і скіраваны на забеспячэнне сумеснай дзенасці людзей, якія імкнуцца да задавальнення культурных патрэбнасцей .

Універсітэт культуры актыўна ўзаемадзейнічае з сацыяльным асяроддзем, аператыўна рэагуе на тыя працэсы, якія адбываюцца ў грамадстве, імкнецца ва ўсіх відах сваёй дзейнасці адпавядаць патрэбнасцям розных суб'ектаў соцыуму, забяспечваць і абараняць інтарэсы чалавека як актыўнага суб'екта культурнай дзейнасці. У працэсе арганізацыі і правядзенні культурна-адпачынкавых мерапрыемстваў акцэнт робіцца на стварэнне ўмоў, неабходных для развіцця ініцыятывы, актыўнай творчасці ўсіх удзельнікаў. Гэта адпавядае новай суб'ект-суб'ектнай тэарэтычнай мадэлі арганізацыі вольнага часу людзей, калі кожны чалавек выступае ў якасці суб'екта арганізацыі ўласнага адпачынку. Новая сацыякультурная сітуацыя ў грамадстве, працэсы дэмакратызацыі і гуманізацыі, дынаміка культурных патрэбнасцей і інтарэсаў чалавека рэалізуюцца ў прынцыпах сацыяльна-культурнай дзейнасці студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта, сярод якіх навукоўцы (А.Дз.Жаркоў, Ю.Дз.Красільнікаў, Т.Р.Кісялёва, В.М.Чыжыкаў) вылучаюць прынцыпы гуманізацыі, свабоды творчай дзейнасці, сама-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

развіцця культурных працэсаў, плюралізму стыляў і накірункаў у творчасці, усеагульнасці культуратворчасці, самаарганізацыі, самасцвярджэнні асобы, дыялектычнага адзінства і пераемнасці культурнагістарычнага, нацыянальна-этнічнага вопыту, традыцый і інавацый, спалучэння дзяржаўных і грамадскіх пачаткаў у арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці [2, 3, 5]. Такім чынам, аснову арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці БДУ культуры складаюць захаванне, трансляцыя, засваенне і развіццё традыцый, каштоўнасцей, нормаў у сферы мастацтва і духоўна-маральнай культуры.

Сацыякультурная дзейнасць студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта ажыццяўляецца ў пазааўдыторны час і адпавядае межам вольнага часу іншых удзельнікаў культурна-адпачынкавых мерапрыемстваў. Пры гэтым у адносінах да студэнтаў пазааўдыторны час толькі з пэўнай доляй умоўнасці можна назваць таксама вольным. Па сутнасці, удзел у правядзенні культурна-адпачынкавых мерапрыемстваў з'яўляецца працягам вучэбнага працэсу: ідзе работа па ўдасканаленні і набыцці новых прафесійных уменняў і навыкаў, рэалізацыі створаных у навучальным працэсе праграм і праектаў, апрабацыі і асваенні культурна-адпачынкавых тэхналогій, методык сацыяльна-культурнай дзейнасці. Гэтая дзейнасць уяўляе дынамічны працэс і таму патрабуе творчага падыходу да вырашэння задач арганізацыі культурнага адпачынку розных сацыяльных груп насельніцтва. Найлепшыя вынікі сацыяльна-культурнай дзейнасці дасягаюцца ў тых выпадках, калі сродкі культурна-творчага працэсу выкарыстоўваюцца комплексна, калі яны ўзаемадзейнічаюць паміж сабой і ўсе разам скіраваны на асобу — на актывізацыю яе творчых сіл, стварэнне ўмоў для духоўнага ўзвышэння, адпачынку.

Сацыяльна-культурная дзейнасць студэнтаў універсітэта культуры ў пазааўдыторны час мае акрэсленую прафесійную накіраванасць. Перыяд навагодніх святаў у грамадстве супадае з завяршэннем вучэбнага семестра ва універсітэце. Своеасаблівай формай падвядзення вынікаў вучэбнай дзейнасці становяцца экзамены-канцэрты, справаздачныя выставы, прадстаўленні, святы. Так, на мяжы 2002/03 гг. студэнты, выкладчыкі і мастацкія вучэбныя калектывы прынялі ўдзел у 25 буйных мерапрыемствах. Сярод іх — канцэрты і тэатралізаваныя прадстаўленні для працоўных Ленінскага і Завадскога раёнаў сталіцы ў Палацах культуры МТЗ і Камвольнага камбіната; канцэрты і карнавалы ў навучальных установах, выступленні перад супрацоўнікамі КДБ, пагранічных войск, міністэрстваў унутраных спраў і абароны Рэспублікі Беларусь. Універсітэт культуры прыняў актыўны ўдзел у навагодняй

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дабрачыннай акцыі “Нашы дзеці” з удзелам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Палацы Рэспублікі, у тэатралізаваных прадстаўленнях для дзяцей-інвалідаў у Палацы культуры ветэранаў, для дзяцей-сірот у Палацы культуры МТЗ, у Дубровенскай школе-інтэрнаце (Віцебская вобласць). Студэнты універсітэта віншавалі дзяцей-інвалідаў у межах акцыі “Нашы сэрцы — хворым дзецям”, якую праводзілі разам з маладзёжным грамадскім аб’яднаннем “Альтэра”. Вучэбныя мастацкія калектывы — арганізатары і ўдзельнікі мастацкай часткі навагодняга прыёму Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, святочных мерапрыемстваў для дэпутатаў Нацыянальнага сходу Беларусі і супрацоўнікаў Адміністрацыі Прэзідэнта. Студэнты універсітэта прынялі ўдзел у духоўным фестывалі “Ave Maria” у касцёле св.Сымона і св.Алены, у юбілейных мерапрыемствах Кіеўскага нацыянальнага універсітэта культуры і мастацтва, выступалі на плошчах і вуліцах г.Мінска.

За правядзенне на высокім мастацкім узроўні навагодніх святаў кіраўніцтва БДУ культуры атрымала пісьмы з падзякай у адрас выкладчыкаў і студэнтаў універсітэта з Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, з міністэрства культуры, Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў, з Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі, з Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры, з Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, з працоўных калектываў і навучальных устаноў Мінска.

Усяго за 2002 год пяцьдзесят дзве вучэбна-творчыя лабараторыі універсітэта, якія аб’ядноўваюць каля 70% студэнтаў дзённай формы навучання, падрыхтавалі і паказалі ў Беларусі і за яе межамі 205 мастацкіх (тэатральных, музычных, харэаграфічных, гульнёвых, эстрадных) праграм, зрабілі 78 запісаў на радыё і тэлебачанні, прынялі ўдзел у 46 конкурсах і чэмпіянатах, у 593 фестывалях, святах, прадстаўленнях, тэатралізаваных і конкурсна-гульнёвых праграмах.

Актыўны ўдзел студэнтаў у сацыяльна-культурнай дзейнасці універсітэта забяспечвае іх хуткі прафесійны рост, а выхаваўчая накіраванасць мерапрыемстваў садзейнічае фарміраванню ў іх актыўнай жыццёвай пазіцыі, высокай агульнай культуры. Выпускнікі універсітэта культуры, засвоіўшы тэорыю і практыку сацыяльна-культурнай дзейнасці ў сценах сваёй «Alma mater», актыўна ўплываюць на функцыянаванне ўсёй сістэмы культурна-адпачынкавай дзейнасці, на павышэнне эфектыўнасці яе работы і рэалізацыю сацыяльных функцый у беларускім грамадстве.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЛІТАРАТУРА:

1. Аб адукацыі: Закон Рэспублікі Беларусь //Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2002 г., № 37, 2/844).

2. Жарков А.Д. Технология культурно-досуговой деятельности. — М.: МГУКИ, НПО «Профиздат», 2002. – 288 с.

3. Киселёва Т.Г., Красильников Ю.Д. Основы социально-культурной деятельности. – М.: МГУК, 1995. – 136 с.

4. Кузьмініч М.Л. Мастацкая творчасць: універсітэцкая падрыхтоўка кадраў. – Мн.: Беларуская навука, 1998. – 142 с.

5. Культурно-досуговая деятельность /Под науч. ред. Жаркова А.Д., Чижикова В.М. – М.: МГУКИ, 1998. – 461 с.

6. Смолік А.І. Сацыяльна-культурная дзейнасць у постчарнобыльскім соцыуме. - Мн.: Бел. ун-т культуры, 1999. – 228 с.

7. Статут установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры" – Мн.: БДУ культуры, 2001. – 32 с.

*Бабич Т.Н.*

## МАНДОЛИНА В МУЗЫКАЛЬНОМ ИСКУССТВЕ БЕЛАРУСИ

Музыкальная культура Беларуси находится на своеобразном пограничье культурных традиций Запада и Востока, где сталкиваются и переплетаются самые разнообразные исторические, политические, конфессиональные, этнографические и культурно-художественные течения. Таким образом, одним из определяющих признаков музыкальной культуры Беларуси является ее открытость, доказательством чему – обилие связей со многими странами – Италией, Германией, Францией, Литвой, Польшей, Россией и Украиной. Беларусь, находясь долгое время в составе западноевропейского государства – Речи Посполитой, - приобретала многие черты и тенденции развития культуры Запада. Примером тому может служить заимствование инструментария из других музыкальных культур. Можно утверждать, что и мандолина была привнесена в концертно-исполнительскую практику Беларуси из западноевропейской музыкальной культуры. Хотя точное время появления инструмента на территории Беларуси не определено. Но и сам исторический аспект появления мандолины в мировом музыкальном искусстве недостаточно исследован. Известно, что инструмент с таким названием зафиксирован в Северной Италии на рубеже XVI–XVII вв.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ